УДК 392:273.2(476.5)



**Уладзімір АЎСЕЙЧЫК**

*Дацэнт кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя і традыцыйная культура этнічных груп Беларусі, пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў.*
*Аўтар звыш 100 навуковых публікацый.*

# Стараверы Беларусі ў 1830 — 1860-я гг.: тэрыторыя рассялення і колькасны склад*

**Гісторыя старaверства на беларускіх землях пачынаецца ў другой палове XVII ст. Царкоўная рэформа патрыярха Нікана ў сярэдзіне XVII ст. выклікала раскол у Рускай Праваслаўнай царкве. Значная частка вернікаў не прыняла наваўвядзенняў, за што падверглася рэпрэсіям і ганенням. Уцякаючы ад пераследу, прыхільнікі старых абрадаў былі вымушаны пакідаць межы Расіі. Адным з накірункаў эміграцыі старавераў сталі беларускія землі, якія ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага.**

**Ключавыя словы:** *стараверы, этнічныя групы, Беларусь, рассяленне, дэмаграфія, этнакультурныя працэсы*

Рассяленне старавераў на беларускіх землях не было раўнамерным. Асноўныя стараверскія цэнтры сфарміраваліся ў паўночным і паўднёва-ўсходнім рэгіёнах краіны. Фрагментарнасць крыніц не дазваляе прадставіць дэмаграфічную характарыстыку стараверскага насельніцтва на беларускіх землях у другой палове XVII — XVIII стст. Паасобныя звесткі аб іх колькасці і месцах рассялення адносяцца толькі да другой паловы XVIII — пачатку XIX ст. Першыя афіцыйныя звесткі аб колькасці старавераў па губернях Расійскай Імперыі маюцца на сярэдзіну 1820-х гг. Пачынаючы з 1826 г. Міністэрства ўнутраных спраў збірала і сістэматызавала даныя аб колькасці стараверскага насельніцтва па губернях Расіі. Таму з гэтага часу існуюць даныя і аб іх колькасці ў беларускіх губернях (*табліца 1*). Але больш поўныя і сістэмныя даныя аб колькасці старавераў і месцах іх пражывання на беларускіх землях адносяцца да канца 1830-х гг.

Як вынікае са статыстычных даных (*табліца 1*), у першай палове XIX ст. найбольшая колькасць старавераў пражывала ў Віцебскай і Віленскай губернях. Значная іх колькасць таксама была зафіксаваная ў Магілёўскай і Мінскай губернях. Аднак даныя па губернях не даюць поўнай карціны рассялення старавераў на беларускіх землях: межы губерняў ахопліваюць не толькі этнічныя беларускія тэрыторыі; арэал рассялення старавераў часта размяшчаўся не ў межах адной губерні,

*Табліца 1*

**Дынаміка колькасці стараверскага насельніцтва ў беларускіх губернях (1826—1846 гг.)**[1]

| Год | Колькасць старавераў у губернях (чал.) | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Віленская | Віцебская | Магілёўская | Мінская | Гродзенская |
| **1826** | 18 121 | 37 752 | 6843 | 3777 | 4 |
| **1827** | 21 071 | 37 246 | 8044 | 4670 | 4 |
| **1837** | 21 265 | 36 017 | 8589 | 7590 | - |
| **1839** | 21 394 | 36 899 | 8714 | 7122 | - |
| **1841**** | 23 152 | 38 432 | 14 200 | 7706 | - |
| **1846** | 10 976 | 38 735 | 14 668 | 4151 | - |

* Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па праекце ДПНД “Этнічныя вобразы ў фальклорнай традыцыі беларусаў Падзвіння XIX — пачатку XXI ст.: тыпалогія і ўзроўні рэпрэзентацыі на ўсходнееўрапейскім фоне” (у рамках задання “Беларускі фальклор у еўрапейскай прасторы”, 2021—2025 гг., рэг. № 20211342).

** Розніца паміж 1841 і 1846 гг.ў колькасці старавераў у Віленскай губерні тлумачыцца тым фактам, што ў 1842 г. са складу Віленскай губерні былі вылучаны шэраг паветаў, з якіх была ўтворана Ковенская губерня, у выніку чаго колькасць старавераў значна паменшылася.

***Стараверы** падзяляюцца на дзве буйныя галіны (толкі): папоўцаў і беспапоўцаў. Папоўцы прызнаюць усе таінствы праваслаўнай царквы, у т.л. і свяшчэнства (адсюль і назва), таму ў іх ёсць святары і епіскапы. Стараверы, якія не "приемлют священства", атрымалі назву беспапоўцаў. У сваю чаргу, кожны з гэтых толкаў падзяляецца на асобныя накірункі (сагласы). Так, у папоўстве на беларускіх землях вылучаюцца веткаўскі і аўстрыйскі сагласы, а ў беспапоўстве — федасееўскі, паморскі і філіпаўскі.*

а пераходзіў на суседнія і г.д. З гэтай прычыны ў артыкуле дэмаграфічная характарыстыка стараверскага насельніцтва Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. прадстаўлена не па губернях, як гэта распаўсюджана ў айчыннай гістарыяграфіі, а ў адпаведнасці з іх зонамі рассялення. Як вынікае з ніжэйпрыведзенага аналізу, на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. існавалі тры зоны кампактнага пасялення старавераў: паўночна-заходняя, паўночна-ўсходняя і паўднёва-ўсходняя.

## Паўночна-заходняя зона рассялення***

У сярэдзіне XIX ст. на тэрыторыі Паўночна-Заходняй Беларусі фіксавалася даволі вялікая зона кампактнага пражывання старавераў на тэрыторыі Ашмянскага, Вілейскага, Дзісенскага паветаў, а таксама беларускіх на землях Свянцянскага і Новааляксандраўскага паветаў[2]. На іншых тэрыторыях Віленскай (маецца на ўвазе толькі беларускія землі), Гродзенскай, паўночна-заходняй часткі Мінскай губерняў старавераў амаль не было зафіксавана (гл. ніжэй). Асноўная колькасць старавераў рэгіёна належала да беспапоўскага накірунку.

Па колькасці старавераў у гэтым рэгіёне вылучаўся ***Новааляксандраўскі павет Ковенскай губерні***, у які ўваходзіла тэрыторыя сучаснага Браслаўскага раёна. Так, у 1848 г. у павеце пражывала 9389 старавераў, у 1851 г. — 10 251. Аднак пачынаючы з 1852 г. назіраецца некаторае памяншэнне іх колькасці. У 1852 г. у Новааляксандраўскім павеце налічвалася 9170 старавераў, у 1853 г. — 7123, у 1854 г. — 6148[3]. Але ў наступныя гады іх колькасць ізноў пачынае расці. У 1863 г.у павеце ўжо налічвалася 8265 чалавек, а ў 1873 — 11 119[4].




*Рассяленне старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі.* Складзена аўтарам.

*** Пры аналізе дэмаграфічных працэсаў (у т.л. спецыфікі рассялення насельніцтва) прымяняецца агульнапрынятае паняцце "зоны рассялення". Пад гэтым паняццем у артыкуле разумеюцца вялікія тэрыторыі рассялення старавераў, якія ўключаюць асобныя арэалы.

Такім чынам, каля трэці стараверскага насельніцтва павета жыло на тэрыторыі сучаснай Беларусі[5].

Стараверы даволі кампактна прыжывалі ва ўсіх валасцях беларускай часткі Новааляксандраўскага павета (Браслаўскай, Відзаўскай, Дрысвяцкай, Краснагорскай, Опсаўскай і Слабадской). У сярэдзіне XIX ст. у рэгіёне налічвалася звыш 150 населеных пунктаў, дзе жылі стараверы[6].

Як вынікае са статыстычных даных, з паветаў Віленскай губерні, тэрыторыя якіх у сучасны перыяд уваходзіць у склад Беларусі, стараверы пражывалі ў Дзісенскім, Свянцянскім, Вілейскім і Ашмянскім. У Лідскім павеце іх амаль не зафіксавана. На поўдзень ад гэтых паветаў (на тэрыторыі Гродзенскай губерні, Мінскага і Навагрудскага паветаў Мінскай губерні) яны амаль не пражывалі. Асноўная колькасць старавераў беларускай часткі Віленскай губерніназіраецца ў Дзісенскім і Свянцянскім паветах. Пэўная іх колькасць налічвалася таксама ў Вілейскім і Ашмянскім паветах (*табліца 2*).

***Дзісенскі павет*** пераважаў па колькасці старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі. Так, у 1839 г. тут налічвалася 2669 старавераў[8]. А ўжо на 1843 г. афіцыйныя даныя прадстаўляюць іх колькасць у 3884 чалавекі[9]. Як сведчаць крыніцы, да канца 1860-х гг. іх лік у павеце заставаўся прыкладна такім самым (*табліца 2*).

Стараверы насялялі тэрыторыю павета на поўнач ад ракі Дзісна. На поўдзень ад ракі іх амаль не было (за выключэннем пасяленняў у ваколіцах вёсак Залессе і Ластавічы на тэрыторыі сучаснага Глыбоцкага раёна). Асабліва вялікая колькасць населеных пунктаў, дзе пражывалі стараверы, была сканцэнтравана ў паўночна-заходняй частцы павета (у сучасны перыяд гэта тэрыторыя Мёрскага і Шаркаўшчынскага раёнаў)[10]. Разам з пасяленнямі ўсходняй часткі Новааляксандраўскага павета яны ўтваралі самы вялікі арэал у Паўночна-Заходняй Беларусі.

*Табліца 2*

**Дынаміка колькасці стараверскага насельніцтва ў беларускіх паветах Віленскай губерні (1843—1873 гг.)[7]**

| Год | *Колькасць старавераў у паветах Віленскай губерні (чалавек)* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | *Дзісенскі* | *Свянцянскі* | *Вілейскі* | *Ашмянскі* | *Лідскі* |
| **1843** | 3884 | 4911 | 392 | 191 | - |
| **1868** | 3921 | 4731 | 483 | 463 | 14 |
| **1873** | 4264 | 5045 | 540 | 570 | - |

Значная колькасць старавераў пражывала ў ***Свянцянскім павеце***. Неабходна адзначыць, што каля паловы тэрыторыі павета ў наш час уваходзіць у склад Літоўскай Рэспублікі. Арэал рассялення старавераў займаў заходнюю частку сучаснага Пастаўскага раёна і паўночныя землі Мядзельскага раёна. Ад в. Лынтупы да Паставаў на ўсходзе і да возера Нарач на поўдні. Паўночная частка тэрыторыі рассялення пераходзіла на тэрыторыю сучаснай Літоўскай Рэспублікі. Найбольш значнымі па колькасці старавераў былі вёскі Апідамы, Кукляны, Вейсішкі, Жвойрышкі, Паташня, Беляншкі. На беларускіх землях Свянцянскага павета існавалі яшчэ два невялікія арэалы рассялення старавераў. Адзін з іх ахопліваў вёскі Стрыпішкі, Ляшчынава, Грэчанішкі, Зароўе і інш. (знаходзіўся на самай поўначы Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці) і пераходзіў на сучасныя літоўскія землі. Цэнтрам другога быў пас. Свір (у сучасны перыяд — пасёлак у Мядзельскім раёне Мінскай вобласці)[11].

У ***Вілейскім павеце*** на 1839 г. пражывала 316 старавераў. У гэты перыяд яны фіксаваліся ў 13 населеных пунктах у паўночнай і паўднёвай частках павета[12]. На працягу 1840—1860-х гг. колькасць стараверскага насельніцтва ў павеце крыху ўзрасла (*табліца 2*).

***Ашмянскі павет*** таксама не адносіўся да ліку густа заселеных старaверамі (*табліца 2*). Па даных на 1860-я гг. адзіны невялікі арэал рассялення старавераў лакалізаваўся на памежжы Трабскай і Гальшанскай валасцей (у сучасны перыяд памежжа Валожынскага, Ашмянскага і Іўеўскага раёнаў Гродзенскай вобласці). Яго цэнтрам была в. Масцішча[13].

Асноўная колькасць старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі назіралася ў сельскай мясцовасці. Сярод гарадскіх цэнтраў вылучаліся толькі г. Відзы ў Новааляксандраўскім павеце і г. Друя ў Дзісенскім павеце. Так, у Відзах у 1869 г. пражываў 361 старавер, у 1879 г. — 487. У Друі ў 1868 г. налічвалася 85 старавераў, у 1872 г. — 107[14]. У г. Дзісна, г. Ашмяны і г. Вілейка ў сярэдзіне XIX ст. старавераў фактычна не фіксавалася.



*Стараверскі храм у в. Кірыліна Браслаўскага раёна.*
Фота аўтара, 2021 г.



*Пячатка стараверскай царквы г. Відзы пачатку XIX ст.* (НГАБ. ф. 136. воп. 1. спр. 7963. арк. 78).



*Стараверскі храм у в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна.* Фота аўтара, 2022 *г.*

## Паўночна-ўсходняя зона рассялення

Зона кампактнага пражывання старавераў лакалізавалася ў паўночна-ўсходняй частцы Беларусі. У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам гэты рэгіён складалі беларускія землі Віцебскай губерні (Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі, Полацкі паветы), паўночныя паветы Магілёўскай губерні (Сенненскі, Аршанскі і Копыскі), а таксама Барысаўскі павет Мінскай губерні.

Большая частка гэтай зоны адносілася да Віцебскай губерні. У табліцы 3 прадстаўлены даныя аб колькасці старавераў у беларускіх паветах Віцебскай губерні ў 1837—1865 гг.

Як бачна з прыведзеных даных, асноўная колькасць старавераў пражывала ў Полацкім і Віцебскім паветах. У гэты перыяд лідарам па колькасці старавераў быў ***Полацкі павет***. Большасць іх фіксавалася ва ўсходняй частцы павета (цяпер — памежжа Полацкага і Шумілінскага раёнаў). Некаторая іх колькасць была сканцэнтраваная на поўначы ад Полацка, вакол в. Жарцы. Шэраг стараверскіх вёсак размяшчаўся на поўдзень ад Полацка ў ваколіцах возера Гомеля. На 1843 г. у Полацкім павеце стараверы пражывалі ў больш чым 100 населеных пунктах[17].

На тэрыторыі ***Віцебскага павета*** ў сярэдзіне XIX ст. стараверы пражывалі дастаткова раўнамерна. Значная іх колькасць была сканцэнтраваная ў ваколіцах самога Віцебска. Але найбольш істотная колькасць пасяленняў размяшчалася ў заходняй частцы павета[18]. Гарадоцкі і Лепельскі паветы саступалі па колькасці стараверскага насельніцтва Віцебскаму і Полацкаму. У межах ***Гарадоцкага павета*** населеныя пункты, дзе пражывала стараверскае насельніцтва, фарміравалі два невялікія арэалы: адзін — на поўначы павета (у Обальскай воласці), другі — на захадзе павета (у Мішневіцкай і Казьянскай валасцях; цяпер — тэрыторыя Шумілінскага раёна)[19].

Большая частка старавераў ***Лепельскага павета*** насяляла яго паўднёва-ўсходнюю частку (Гарадчэвіцкая, Цяпінская, Бешанковіцкая і Бачэйкаўская валасці). У сучасны перыяд гэта тэрыторыя памежжа Лепельскага, Чашніцкага і Бешанковіцкага раёнаў. На 1838 г. стараверы фіксаваліся ў 21 населеным пункце павета, а ў першай палове 1860-х гг. іх было ўжо больш за 30[20].

На тэрыторыі ***Дрысенскага павета*** старавераў фіксавалася даволі мала. Асноўная іх частка налічвалася ў мястэчку Прыдруйск (цяпер — Піедруя, Латвія), вёсках Юхневічы і Аколіца Пустынскай воласці (у сучасны перыяд знаходзяцца на тэрыторыі Латвіі)[21]. Такім чынам, асноўная колькасць старавераў Дрысенскага павета ў сярэдзіне XIX ст. пражывала за межамі сучаснай Рэспублікі Беларусь.

У сярэдзіне XIX ст. пераважная колькасць старавераў беларускіх паветаў Віцебскай губерні адносілася да беспапоўскага накірунку. У рэгіёне пражывалі федасееўцы, філіпаўцы і паморцы. Але ў рэгіёне

*Табліца 3*

**Дынаміка стараверскага насельніцтва ў беларускіх паветах Віцебскай губерні (1837—1865 гг.)[15]**

| *Год* | *Колькасць старавераў у паветах Віцебскай губерні (чал.)* | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | *Віцебскі* | *Гарадоцкі* | *Дрысенскі* | *Лепельскі* | *Полацкі* | *Усяго* |
| **1837** | 1747 | 406 | 49 | 615 | 3281 | 6098 |
| **1838** | 1792[16] | 262 | 163 | 498 | 3321 | **6036** |
| **1843** | 1852 | 254 | 238 | 593 | 3934 | **6871** |
| **1861** | 1412 | 225 | 268 | 367 | 2141 | **4413** |
| **1865** | 2167 | 427 | 256 | 812 | 3626 | **7288** |




*Тэрыторыя рассялення старавераў у паўночна-ўсходняй частцы Беларусі ў сярэдзіне XIX ст.* Складзена аўтарам.

былі і стараверы-папоўцы веткаўскага сагласа. Згодна са статыстычнымі данымі на 1843 г., каля 1/5 (20,78%) ад агульнай колькасці старавераў беларускіх паветаў папоўцы[22]. Даволі вялікая колькасць старавераў-папоўцаў пражывала ў г. Віцебску і Віцебскім павеце, Гарадоцкім і Лепельскім паветах. У Полацкім павеце старавераў-папоўцаў амаль не прысутнічала.

У сярэдзіне XIX ст. большасць стараверскага насельніцтва беларускіх паветаў Віцебскай губерні з'яўлялася вясковымі жыхарамі. У гарадах, акрамя Віцебска і Полацка, а таксама зусім невялікай колькасці ў Гарадку, яны не пражывалі. Большасць старавераў жыла у Віцебску.

Важным цэнтрам стараверства на беларускіх землях быў ***Барысаўскі павет*** Мінскай губерні. Асноўная колькасць старавераў пражывала ў яго паўночна-ўсходняй частцы (на мяжы з Лепельскім і Сенненскім паветамі). У сучасны перыяд гэта тэрыторыя памежжа Барысаўскага, Крупскага і Чашніцкага раёнаў. Так, у 1839 г. у павеце налічвалася 1878 старавераў[23]. У 1850—1860-я гг. іх колькасць у павеце, згодна з афіцыйнымі данымі, некалькі зменшылася: у 1858 г. іх фіксавалася 1493 чалавекі, у 1863 г. — 1509[24]. Сярод цэнтраў стараверства ў павеце вылучаліся вёска Бабарыкі і засценак Будзішча. У гэтых населеных пунктах існавалі стараверскія малельні[25]. Асноўная колькасць старавераў Барысаўскага павета — сельскія жыхары.



*Сяляне-стараверы Лепельскага павета.* Фота М. Кусцінскага, 1866 г. (F46-Vilniaus viešoji biblioteka ir senienų muziejus.)

У горадзе Барысаве адзначаўся зусім невялікі іх лік, які не перавышаў 50 чалавек[26].

Істотная колькасць стараверскага насельніцтва налічвалася ў ***Сенненскім павеце*** Магілёўскай губерні. У 1842 г. тут было 862 стараверы, а ў 1844 г. — 874 (усе пазначаны як папоўцы)[27]. На пачатку 1860-х гг. колькасць старавераў у павеце перавышала ўжо 1000 чалавек[28]. А ў 1865 г. у павеце налічвалася 1906 старавераў (з іх 371 беспаповец, астатнія — папоўцы)[29]. Асноўная колькасць старавераў Сенненскага павета пражывала ў яго паўночнай частцы (Астровенская, Машканская і Латыгаўская воласці; сучасная тэрыторыя Бешанковіцкага і Сенненскага раёнаў). Пэўная лічба стараверскага насельніцтва фіксавалася таксама ў заходняй частцы павета (у Лукомскай, Лісічынскай і Бобрскай ваоласцях) на мяжы з Барысаўскім і Лепельскім паветамі. У самім павятовым цэнтры старавераў да канца XIX ст. амаль не назіралася.

У сярэдзіне XIX ст. некаторая колькасць стараверскага насельніцтва пражывала ў ***Копыскім павеце*** Магілёўскай губерні. Па афіцыйных даных, 1842 г. — 262[31]. Як сведчаць крыніцы, да пачатку 1860-х гг. лічба старавераў у павеце заставалася прыкладна такой самай (у 1859 г. — 289 чалавек, у 1861 г. — 280[32]). Колькасць населеных пунктаў, дзе жылі стараверы, была невялікай. Усе яны размяшчаліся ў яго заходняй частцы на мяжы з ***Барысаўскім паветам***.

Лік старавераў у ***Аршанскім павеце*** ў сярэдзіне XIX ст. заставаўся нязначным. Так, у 1842 г. у павеце пражывала 89 старавераў, а ў 1844 г. — 74. Усе яны ў афіцыйных справаздачах указваліся як папоўцы[33]. У наступныя гады іх колькасць у павеце падае. На 1859 г. было зафіксавана толькі 17 чалавек, а ў 1861 — 20[34].

Трэба адзначыць, што ў паветах Магілёўскай губерні, якія знаходзіліся на поўдні ад Сенненскага, Аршанскага і Копыскага паветаў, старавераў амаль не прысутнічала (гл. ніжэй). Такім чынам, пасяленні гэтых паветаў замыкалі паўночна-ўсходнюю зону расcялення старавераў на Беларусі.

## Паўднёва-ўсходняя зона рассялення

Трэцяя зона кампактнага рассялення старавераў лакалізавалася ў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі. З сярэдзіны XVII ст. гэты рэгіён з’яўляўся адным з важнейшых цэнтраў стараверства. У сярэдзіне XIX ст. асноўная колькасць старавераў рэгіёна была сканцэнтраваная на тэрыторыі Гомельскага і Рагачоўскага паветаў Магілёўскай губерні, Бабруйскага павета Мінскай губерні. У рэгіёне пражывалі як стараверы-папоўцы, так і беспапоўцы.

Найбольшая колькасць стараверскага насельніцтва ў рэгіёне пражывала ў ***Гомельскім павеце*** (да 1852 г. насіў назву Беліцкага). Яго тэрыторыя з’яўлялася адным з гістарычных цэнтраў стараверства на беларускіх землях. У межах павета знаходзіўся духоўны цэнтр старавераў-папоўцаў — мястэчка Ветка. На долю павета прыпадала большая частка стараверскага насельніцтва рэгіёна. Згодна з афіцыйнымі данымі, у 1844 г. на тэрыторыі ***Беліцкага павета*** (разам з г. Беліцай) налічвалася 11 824 старавераў. Усе яны былі папоўцамі[35]. У 1859 г. у павеце фіксаваўся 12 971 старавер, а праз два гады іх колькасць вырасла да 14 999 чалавек[36]. Але на працягу 1860 г. — першай паловы 1870-х гг. колькасць старавераў у павеце паменшылася. На 1875 г.налічвалася толькі 11 426 чалавек[37].

Другім па ліку старавераў у рэгіёне быў ***Бабруйскі павет*** Мінскай губерні. Так, у 1839 г. у павеце налічвалася 1920 прыхільнікаў старых абрадаў. У гэты час яны пражывалі больш чым у 20 населеных пунктах павета. У гэтым жа 1839 г. стараверскія храмы працавалі ў слабодах[38] Капусцінай, Туркі, Салоціна[39]. У наступныя дзесяцігоддзі колькасць старавераў у павеце крыху вырасла. Так, у 1858 г. у ім налічвалася 2285 старавераў, а ў 1871 г. 3232 чалавекі[40]. У сярэдзіне XIX ст. амаль усё стараверскае насельніцтва Бабруйскага павета пражывала ва ўсходняй яго частцы, на мяжы з Рагачоўскім паветам Магілёўскай губерні. Пасяленні, дзе фіксаваліся стараверы, утваралі дастаткова кампактны арэал.

Да лідараў па колькасці старавераў у рэгіёне належаў таксама Рагачоўскі павет Магілёўскай губерні. Афіцыйныя даныя паведамляюць на 1844 г. пра 765 старавераў, якія пражывалі ў 14 населеных пунктах павета. На 1844 г. у Рагачоўскім павеце дзейнічалі тры стараверскія храмы (“часовни”) — у в. Покаць, в. Галоднае, слабадзе Турск. Як сведчаць крыніцы, у павеце жылі як беспапоўцы, так і папоўцы. Папоўцаў у 1844 г. налічвалася 465 чалавек, а беспапоўцаў — 300[41]. Але ўжо ў 1850-х гг. іх колькасць была амаль аднолькавай. Беспапоўскія пасяленні ў асноўным размяшчаліся ў заходняй частцы павета на мяжы з Бабруйскім паветам і ўваходзілі ў арэал, асноўная частка якога размяшчалася на тэрыторыі Бабруйскага павета. Большасць пасяленняў старавераў-папоўцаў размяшчалася ў паўднёвай частцы павета. Колькасць старавераў у Рагачоўскім павеце да канца 1850-х гг. заставалася прыкладна такой жа. Так, у 1859 г. тут налічвалася 708 старавераў. У наступныя дзесяцігоддзі іх лічба некалькі вырасла. У 1875 г. яна перавысіла тысячу чалавек[42].

У сярэдзіне XIX ст. ***Магілёўскі павет*** не вылучаўся асаблівай колькасцю стараверскага насельніцтва. Так, у 1844 г. у павеце разам з губернскім цэнтрам Магілёвам пражываў толькі 81 старавер[43]. У Быхаўскім, Горацкім, Клімавіцкім, Мсціслаўскім, Чэрыкаўскім і Чавускім паветах Магілёўскай губерні, а таксама Ігуменскім і Рэчыцкім паветах Мінскай губерні ў сярэдзіне XIX ст. старавераў было даволі мала. У гэты перыяд на тэрыторыі большасці гэтых паветаў іх амаль не фіксаваліся.

Сярод гарадскіх цэнтраў паўднёва-ўсходняй Беларусі, у якіх пражывала стараверскае насельніцтва, вылучаліся Гомель і Бабруйск. Асноўная колькасць стараверскага гарадскога насельніцтва налічвалася ў Гомелі. У 1859 г. у ім пражывала 3114 старавераў, а ў 1861 г. — 5182[44]. У астатніх гарадах Магілёўскай губерні старавераў адзначалася мала. Сярод гарадоў усходняй часткі Мінскай губерні стараверы жылі ў Бабруйску і Рэчыцы.




*Асаблівасці рассялення старавераў у паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі ў сярэдзіне XIX ст.*
Складзена аўтарам.

У 1839 г. у Бабруйску налічвалася 190 старавераў, у 1858 г. — 347, у 1863 г. — 397. У Рэчыцы колькасць старавераў на працягу дадзенага перыяду была невялікай. Так, у 1858 г. у горадзе налічвалася толькі 56 чалавек[45].

У сярэдзіне XIX ст. у цэнтральнай і паўднёва-заходняй частках Беларусі старавераў пражывала вельмі мала. Статыстычныя даныя сведчылі аб амаль поўнай адсутнасці старавераў на тэрыторыі Гродзенскай губерні. Згодна з данымі на 1826 і 1827 гг. у губерні налічвалася толькі 4 стараверы. А ў 1830 г. — пачатку 1850-х г. у губерні старавераў увогуле не зафіксавана[46]. У цэнтральных і паўднёва-заходніх паветах Мінскай губерні старавераў таксама амаль не было. Некаторая колькасць пражывала толькі ў ***Мінскім павеце***. У 1839 г. у ім налічвалася 114 чалавек па 11 населеных пунктах, што ўтваралі невялікі арэал на поўнач ад Мінска. Нязначны лік назіраўся таксама ў ***Мінску***. На 1838 г. у горадзе налічвалася 19 чалавек. Але, як сведчаць крыніцы, да канца гэтага года з горада выбыла 9 старавераў.

## Заключэнне

У сярэдзіне XIX ст. стараверскае насельніцтва было засяроджана пераважна ў Паўночнай і Паўднёва-Усходняй Беларусі. У гэтых рэгіёнах стараверскія пасяленні ўтваралі тры кампактныя зоны: паўночна-заходнюю, паўночна-ўсходнюю і паўднёва-ўсходнюю. У іншых частках краіны старавераў у гэты час амаль не фіксавалася.

Паўночна-заходняя зона ўключала тэрыторыі Новааляксандраўскага, Дзісенскага, Свянцянскага, Ашмянскага і Вілейскага паветаў. У гэты перыяд у рэгіёне пражывала каля 10 тыс. старавераў. Асноўная маса стараверскіх пасяленняў знаходзілася ў межах Дзісенскага і Новааляксандраўскага паветаў (сучасныя тэрыторыі Браслаўскага, Мёрскага і Шаркаўшчынскага раёнаў). Яшчэ адзін значны арэал распаўсюджання стараверскага насельніцтва лакалізаваўся ў межах Свянцянскага павета (сучасная тэрыторыя Пастаўскага раёна). Невялікія арэалы фіксаваліся на тэрыторыі Свянцянскага, Ашмянскага і Вілейскага паветаў. Неабходна адзначыць, што некаторыя тэрыторыі пражывання выходзілі за беларускія землі і мелі працяг на сучасных тэрыторыях Літвы і Латвіі.

Другім рэгіёнам кампактнага рассялення старавераў была паўночна-ўсходняя частка Беларусі. У межах рэгіёна стараверы пражывалі ў Полацкім, Віцебскім, Гарадоцкім, Сенненскім паветах, а таксама ва ўсходняй частцы Лепельскага і на паўночных землях Барысаўскага павета. Невялікая іх колькасць фіксавалася ў і Аршанскім і Копыскім паветах. У сярэдзіне XIX ст., як вынікае з аналізу афіцыйных даных, лік старавераў у рэгіёне складаў каля 9—11 тыс. чалавек. Асноўная маса стараверскіх пасяленняў лакалізавалася на тэрыторыі Полацкага і Віцебскага паветаў. Яшчэ адзін вялікі арэал распаўсюджання стараверскага насельніцтва назіраўся на памежжы Сенненскага, Лепельскага і Барысаўскага паветаў.

Вялікую колькасць насельніцтва стараверы складалі ў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі. Асноўнымі рэгіёнамі іх рассялення сталі Гомельскі (Беліцкі), Бабруйскі і Рагачоўскі паветы. Па колькасці стара-

верскага насельніцтва гэта зона з’яўлялася лідарам на беларускіх землях (у 1860-я гг. тут налічвалася каля 20 тыс. стараверaў). У гэтым рэгіёне лакалізаваліся два вялікія арэалы рассялення стараверскага насельніцтва: Гомельска-Веткаўскі і Бабруйскі.

Пераважная большасць стараверaў Беларусі пражывала ў сельскай мясцовасці, а доля гараджанаў сярод іх была невялікай. Асноўнымі гарадскімі цэнтрамі, дзе фіксавалася значная колькасць стараверскага насельніцтва, былі Гомель, Віцебск, Полацк, Бабруйск, Відзы і Друя.

---

[1] Табліца складзена паводле: Варадинов Н.В. История Министерства внутренних дел. С. 160, 163, 170, 171, 173, 374, 376, 378, 446—447.

[2] Пасля 1842 г. гэтыя тэрыторыі адміністрацыйна адносяцца да Віленскай і Ковенскай губерняў (да апошняй — толькі Новааляксандраўскі павет). У першай палове XIX ст. адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у гэтай частцы Беларусі быў крыху іншым. Віленская губерня да 1840 г. мела назву Літоўска-Віленская. Да 1842 г. Новааляксандраўскі павет (да 1836 г. ён меў назву Браслаўскі) знаходзіўся ў складзе Віленскай губерні. А ў 1842 г. ён і яшчэ 6 паветаў былі вылучаныя з Віленскай губерні і ўтварылі Ковенскую губерню. У гэтым жа годзе да Віленскай губерні былі далучаныя Вілейскі і Дзісенскі паветы са складу Мінскай губерні, а з Гродзенскай — Лідскі павет.

[3] Афанасьев Д.Ф. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Т. 11: Ковенская губерния. Санкт-Петербург, 1861. С. 502.

[4] Памятная книжка Ковенской губернии на 1864 год. Ковно, 1864. Ч. 2. С. 82—84; Памятная книжка Ковенской губернии на 1875 год. Ковно, 1874. С. 142.

[5] Аўсейчык У.Я. Рассяленне і дэмаграфічная характарыстыка старавераў паўночна-заходняй Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. 2021. Т. 13. № 1. С. 61.

[6] Корецкий П.И. О раскольниках в Ковенской губернии // Памятная книжка Ковенской губернии на 1863 год. Ковно, 1863. Отдел II. С. 19—23.

[7] Табліца складзена паводле: Памятная книжка Виленской губернии на 1845 год. Вильна, 1845. С. 170—171; Памятная книжка Виленской губернии на 1870 год. Вильна, 1870. С. V; Памятная книжка Виленской губернии на 1875 год. Вильна, 1875. С. VII.

[8] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 295, воп. 1, спр. 701, арк. 38.

[9] Памятная книжка Виленской губернии на 1845 год. С. 170—171.

[10] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 701, арк. 35—38; Сведения о населенных местах Виленской губернии, собранные губернским статистическим комитетом МВД по предписанию Министра внутренних дел от 9 апреля 1859 г., для подготовки издания Полного списка населенных мест Российской Империи. 1866. 649 л. (Место хранения оригинала: РГИА. Ф. 1290. Оп. 4. Д. 100). Электронный ресурс. Режим доступа: https://www.prlib.ru/item/466667, арк. 454—600.

[11] Сведения о населенных местах Виленской губернии, собранные губернским статистическим комитетом МВД по предписанию Министра внутренних дел от 9 апреля 1859 г., для подготовки издания Полного списка населенных мест Российской Империи. Часть II. 1866. 708 л. (Место хранения оригинала: РГИА. Ф. 1290, оп. 4, д. 101). Электронный ресурс. Режим доступа: https://www.prlib.ru/item/466668. арк. 347, арк. 356—358, арк. 374—375, арк. 430—450.

[12] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр.701, арк. 9, арк. 51.

[13] Сведения о населенных местах Виленской губернии, собранные губернским статистическим комитетом МВД по предписанию Министра внутренних дел от 9 апреля 1859 г., для подготовки издания Полного списка населенных мест Российской Империи. Часть II. 1866. 708 л. (Место хранения оригинала: РГИА. Ф. 1290. Оп. 4. Д. 101). Электронный ресурс. Режим доступа: https://www.prlib.ru/item/466668. арк. 230, арк. 232, арк. 537, арк. 541.

[14] Памятная книжка Ковенской губернии на 1871 год. Ковно, 1870. С. 145; Памятная книжка Ковенской губернии на 1881 год. Ковно, 1880. С. 310.

[15] Табліца складзена паводле: НГАБ. Ф. 1430, спр. 7602, арк. 24—91а; НГАБ. Ф. 1430, спр. 10543, арк. 96аб—97; Памятная книжка Витебской губернии на 1863 год. С. 613; Памятная книжка Витебской губернии на 1867 год. С. 292—293.

[16] Згодна з рапартам на 1838 г. па Віцебскаму павеце (без горада) былі пададзеныя звесткі за 1837 г., бо не паспелі зрабіць падлікі ў гэтым годзе. А даныя па горадзе Віцебску былі пададзеныя ўжо за 1838 г. НГАБ. Ф. 1430, спр. 7602, арк. 77—78.

[17] НГАБ. Ф.1430, спр. 10543, арк. 17.

[18] НГАБ. Ф. 1430, спр. 10543, арк. 71; Списки населенных мест Витебской губ. по уездам, станам, приходам со сведениями об их расположении и народонаселении. Часть I. 1866. 646 л. (РГИА. Ф. 1290, оп. 4, д. 102). Электронный ресурс. Режим доступа: https://www.prlib.ru/item/466832. Арк. 188—290.

[19] НГАБ. Ф. 1430, воп. 1, спр.7602, арк. 67об—68; Списки населенных мест Витебской губ. по уездам, станам, приходам со сведениями об их расположении и народонаселении. Часть I.

[20] НГАБ. Ф. 1430, воп. 1, спр. 7602, арк. 80—89; Сведения о населенных местах Витебской губернии, арк. 8—90.

[21] Сведения о населенных местах Витебской губернии, арк. 627—644.

[22] НГАБ. Ф. 1430, воп. 1, спр.1 0543, арк. 96аб—97.

[23] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 701, арк. 3.

[24] Памятная книжка Минской губернии на 1860 год. Минск, 1859. С. 22—29; Памятная книжка Минской губернии на 1865 год. Минск, 1864. С. 10.

[25] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 701, арк. 56.

[26] Памятная книжка Минской губернии на 1865 год. С. 10.

[27] НГАБ. Ф. 2001, воп. 1, спр. 1710, арк. 40аб; НГАБ. Ф. 2001, воп. 1, спр. 258, арк. 36аб—39.

[28] Памятная книжка Могилевской губернии на 1863 год. Могилев, 1862. С.72—73.

[29] НГАБ. Ф. 2001, воп. 1, спр. 982, арк. 19аб—20.

[30] НГАБ. Ф. 2001, воп. 1, спр. 258, арк. 36аб—39; НГАБ. Ф. 2001, воп. 1, спр. 743, арк. 46—48.

[31] НГАБ. ф. 295, воп. 1, спр. 701, арк. 19.

[32] НГАБ, ф. 295, воп. 1, спр. 701, арк. 19; Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. Могилев, 1861. С. 14—22; Памятная книжка Могилевской губернии на 1863 год. С. 72—73.

[33] НГАБ., Ф. 2001, воп. 1, спр. 1710, арк. 32аб; НГАБ., Ф. 2001, воп. 1, спр. 258, арк. 36аб—37.

[34] Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. С.14—22; Памятная книжка Могилевской губернии на 1863 год. С. 72—73.

[35] НГАБ. Ф. 2001, воп. 1, спр. 258, арк. 66аб—67.

[36] Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. С. 14—22; Памятная книжка Могилевской губернии на 1863 год. С. 72—73.

[37] Обзор Могилевской губернии за 1875 год. Могилев, 1876. С. 80.

[38] У архіўных дакументах сярэдзіны XIX ст. гэтыя населеныя пункты часта ўказваюцца не толькі як слабоды, але і як сёлы і вёскі.

[39] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 701, арк. 13, арк. 44—44аб, арк. 56.

[40] Памятная книжка Минской губернии на 1860 год. С. 22—29; Памятная книжка Минской губернии на 1873 год. С. 232.

[41] НГАБ. Ф. 2001, воп. 1, спр. 258, арк. 5аб, арк. 6—6аб, арк. 15, арк. 27аб—28.

[42] Обзор Минской губернии за 1875 год. Минск, 1876. С. 80.

[43] НГАБ. Ф. 2001, воп. 1, спр. 258, арк. 66аб—67.

[44] Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. С. 14—22; Памятная книжка Могилевской губернии на 1863 год. С. 73.

[45] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 701, арк. 55; Памятная книжка Минской губернии на 1860 год. С. 22—29; Памятная книжка Минской губернии на 1865 год. С. 10.

[46] Варадинов Н.В. История Министерства внутренних дел. С. 160, 171, 375, 377, 576.

*Паступіў у рэдакцыю 24.06.2022.*